Ба208050

# Максім БАГДАНОВІЧ У МІНСКУ

# Максим БОГДАНОВИЧ В МИНСКЕ



Ба 208050 бр

М. А. ЧЫРСКІ
Н. А. ЧИРСКИЙ

# Максім БАГДАНОВІЧ У МІНСКУ

# Максим БОГДАНОВИЧ В МИНСКЕ

Бел. 2005

МІНСК
«ПОЛЫМЯ»
1986

Дзяржаўная бібліятэка БССР

ББК 83.3 Бел. л.6
Ч-65

Рэцэнзенты:
**Н. Б. Ватацы** — галоўны бібліёграф ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга бібліятэкі імя У. І. Леніна,
**М. Р. Яраш** — канд. філалагічных навук

Фота **В. І. Ждановіча**

**Чырскі М. А.**
Ч-65 Максім Багдановіч у Мінску.— Мн., Полымя, 1986.— 32 с., іл.

Аўтар пуцевадзіцеля — экскурсавод Мінскага бюро падарожжаў і экскурсій расказвае пра беларускага паэта, вядзе чытача па вуліцах горада, якія звязаны з жыццём і творчасцю Максіма Багдановіча. Ілюстрацыі дапаўняюць расказ аўтара.
Адрасаваны тым, хто цікавіцца культурай беларускага народа.

**Ч $\frac{4603010201-035}{М\ 306(05)-86}$ 16—86** **ББК 83 3Бел л.6**

© Выдавецтва «Полымя», 1986.

10. 2. 2010

Вы кажаце мне, што душа ў паэта,
Калі спараджае ён дзіўныя вершы,
Нябесным агнём абагрэта...

У гісторыі кожнага народа ёсць імёны, якімі ён асабліва ганарыцца. Але ёсць сярод іх і такія, якія сталі здабыткам чалавецтва, бо слава іх перасягнула межы краін і часоў. Беларускі паэт Максім Багдановіч набыў вядомасць сваім літаратурным, грамадзянскім і чалавечым подзвігам. Яго імя заслужана стаіць побач з імёнамі заснавальнікаў сучаснай беларускай літаратуры — Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Звонкая ліра Багдановіча надзвычай багатая па зместу, па форме і па той сіле веры ў працоўны народ Радзімы, якая зрабіла паэта адным з прагрэсіўных людзей свайго часу. Максім Багдановіч быў не толькі аўтарам пейзажнай, любоўнай, сацыяльна-філасофскай лірыкі, фальклорна-эпічных паэм, але і самабытным празаікам-апавядальнікам, эсэістам, майстрам паэтычнага перакладу, тонкім, бліскучым літаратурным крытыкам і глыбокім вучоным-даследчыкам — адным з заснавальнікаў беларускага літаратуразнаўства.

Паэзія Багдановіча, прасякнутая патрыятызмам і жыццясцвярджальным пафасам, нагадвае святло жывога пульсуючага сэрца, што аднойчы вырвалася з грудзей сына Беларусі і пералілося ў нязгасную зорку Венеру над разлогамі роднай зямлі.

Разгарайся хутчэй, мой агонь,
між імглы,—
Хай цябе шум вятроў не пужае:
Пагашаюць яны аганёчак малы,
А вялікі — крапчэй раздуваюць.

...На доме № 25 па вул. М. Горкага (былой Аляксандраўскай) устаноўлена мемарыяльная дошка з барэльефам паэта. На ёй словы:

*«На гэтым месцы знаходзіўся дом, у якім 9 снежня (27 лістапада) 1891 года нарадзіўся выдатны беларускі паэт Максім Багдановіч».*

На пагорку, дзе сёння стаіць Дзяржаўны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета БССР, знаходзіўся Троіцкі базар. А насупраць якраз і быў гэты двухпавярховы драўляны дом. На першым паверсе размяшчалася гарадское пачатковае вучылішча, на другім — кватэра настаўніка. Яе займала сям'я Багдановічаў: Адам Ягоравіч быў загадчыкам гэтага вучылішча, а Марыя Апанасаўна займалася вы-



*Максім Адамавіч Багдановіч*
*Максим Адамович Богданович*

хаваннем сваіх дзяцей. У гэтай кватэры і нарадзіўся Максім Багдановіч — чалавек незвычайнага таленту і лёсу.

Знаёмых і сяброў у сям'і было многа: настаўнікі, урачы, афіцэры. У доме часта збіралася моладзь, гучалі песні, дэкламацыі.

Бацька паэта, Адам Ягоравіч, скончыў Нясвіжскую настаўніцкую гімназію. Працуючы настаўнікам, ён захапляўся этнаграфіяй, вывучаў і збіраў фальклор, наогул быў чалавекам высокаадукаваным, перадавых поглядаў. Этнаграфічныя, літаратуразнаўчыя і мовазнаўчыя яго працы ўвайшлі ў гісторыю беларускай і рускай культуры, былі заўважаны і высока ацэнены спецыялістамі. Шырокая адукаванасць бацькі, яго добрае веданне фальклору, педагагічная падрыхтоўка спрыялі ўсебаковаму



*Маці паэта — Марыя Апанасаўна*
*Мать поэта — Мария Афанасьевна*

развіццю Максіма, абуджалі ў ім імкненне да творчасці.

Марыя Апанасаўна была жанчынай добрай, вясёлай, прыгожай, з іскрынкай у вачах і з цудоўнай, вялікай касой. Яна мела спецыяльную музычную падрыхтоўку, добры голас. Сярод песень, якія яна любіла спяваць, быў раманс «Паўночная зорка» М. Глінкі. І пазней, праз шмат гадоў, паэт неаднаразова слухаў у грамафонным запісу хвалюючую мелодыю свайго дзяцінства.

Калі Максіму было паўгода, сям'я пераехала ў Гродню, і ранняе дзяцінства хлопчыка прайшло ў



*Бацька паэта — Адам Ягоравіч*
*Отец поэта — Адам Егорович*

горадзе над Нёманам. Пасяліліся Багдановічы на ўскрайне горада. У двары рос невялікі сад, навокал былі палі, лес і Нёман. Жылі Багдановічы дружна і шчасліва.

Хлопчык вельмі любіў, калі маці іграла на фартэп'яна: яе любімыя творы станавіліся любімымі творамі Максіма. Як і маці, яму падабаўся старадаўні раманс «Я адзін выходжу на дарогу» на словы М. Ю. Лермантава, «Элегія» Маснэ, паланез «Развітанне з радзімай» М. Агінскага, дзявочы хор з «Аскольдавай магілы» А. М. Вярстоўскага, творы А. С. Даргамыжскага, М. І. Глінкі, народныя песні. Музыка ўвайшла ў жыццё паэта вельмі рана і зрабіла пэўны ўплыў на яго творчасць.

Марыя Апанасаўна шмат чытала, мела літаратурныя здольнасці. Адно яе апавяданне было нават надрукавана ў «Гродненских губернских ведомостях». Вельмі чулая, уражлівая і надзвычай знаходлівая ў выдумках усялякіх забаў для дзяцей маці сама аддавалася гульням са шчырым захапленнем. Па ўспамінах бацькі, Максім мяккім характарам, весялосцю, жвавасцю, спагадлівасцю і ўражлівасцю, пластычнасцю і трапнасцю назіраннясў нагадваў сваю маці.

Вобраз той, хто даў яму жыццё, як і вобраз радзімы, вечна жыў у Максімавым сэрцы, зачароўваў яго, абуджаў неадольнае імкненне да беларускай зямлі, беларускага народа, беларускай мовы.

Мастацка-творчая атмасфера, што панавала ў сям'і Багдановічаў, аказала вялікі ўплыў на фарміраванне таленту будучага паэта. З ранніх гадоў з хваляваннем слухаў ён казкі і песні маці, з цікавасцю чытаў нарысы і артыкулы бацькі — вядомага беларускага даследчыка, этнографа, захапляўся беларускімі казкамі, якія былі запісаны вядомымі беларускімі фалькларыстамі П. В. Шэйнам і Е. Р. Раманавым.

Вучыцца Максім пачаў з шасці год. Першымі кнігамі яго былі «Родное слово» і «Детский мир и Хрестоматия» К. Д. Ушынскага, рускія быліны, «Слово о полку Игореве», быліны і песні розных народаў, «Эдда», «Песнь о Нибелунгах», «Песнь о Роланде», «Песнь о моем Сиде», «Одиссея» і «Иллиада» і інш. З сусветнай і рускай класікі Максіма прыцягвалі Т. Таса, А. Дантэ, С. Сервантэс, Д. Дэфо, А. Міцкевіч, А. С. Пушкін, М. В. Гогаль, І. С. Тургенеў, Г. І. Успенскі. Кнігі сістэматызавалі тое, што даводзілася назіраць у жыцці, дапамагалі фарміраванню светапогляду. Пазней М. Багдановіч гаварыў сваму сябру М. Р. Агурцову, з якім яны разам працавалі ў Яраслаўскай газеце «Голас»: «Мяне выхоўваў бацька. Неяк я паказваў Вам яго бібліятэку. У ёй ёсць усё істотнае, што з'яўлялася калісьці ў літаратуры ўсяго свету. Мы з дзяцінства праходзілі гэту сусветную школу. Бацька пачынаў з таго, з чаго пачынае кожны народ у сваёй творчасці,— з эпасу. Мы ў дзяцінстве ведалі «Слово о полку Игореве»,— «Иллиаду», «Калевалу» і інш. Потым прыступілі да лірыкі і драмы. Вядома, галоўная ўвага звярталася на славянскія літаратуры».

Таленавіты ад прыроды, надзелены паэтычнай душой маленькі Максім меў цудоўныя ўмовы для развіцця лепшых сваіх задаткаў. Але ў кастрычніку 1896 года на дваццаць восьмым годзе жыцця ад



*Максім (злева) со сваімі братамі*
*і цёткай Аляксандрай Апанасаўнай*
*Максим (слева) со своими братьями*
*и тетей Александрой Афанасьевной*

сухотаў памерла маці... Страта самага роднага чалавека глыбокім болем аддалася ў чулым сэрцы пяцігадовага хлапчука.

У лістападзе бацька з асірацелымі дзецьмі (Вадзімам, Максімам, Лёвам і Нінай) пераехаў у Ніжні Ноўгарад. Гадаваць дзяцей спачатку яму дапамагала сястра Марыя Ягораўна, а потым іх цётка па маці Аляксандра Апанасаўна.

У горадзе на Волзе Максім Багдановіч правёў амаль палову свайго жыцця. Тут не раз выходзіў ён на Волжскі адхон, да самага прыгожага кутка горада, дзе погляд яго міжволі скіроўваўся на сівую крамлёўскую сцяну, на захад, у бок шматпа-



*Максім Багдановіч*
*са сваімі сябрамі ў двары*
*гасціннага дома Кукуявых.*
*Каля сценкі*
*з кружкай Аня Кукуява.*
*Максим Богданович*
*со своими друзьями во дворе*
*гостеприимного дома Кукуевых.*
*У стены с кружкой*
*Аня Кукуева. Ярославль.*



*Максім Багдановіч — гімназіст*
*Максим Богданович — гимназист*

кутлівай Беларусі. Па расказах бацькі перад яго вачыма паўставалі жахлівыя малюнкі з жыцця беларускага народа. Боль яго чулага сэрца павялічвалася яшчэ больш, калі ён бачыў цяжкія ўмовы жыцця рабочых вялікага прамысловага горада. Паступова ў душы паэта нарастаў пратэст. Гэтаму спрыяла і вучоба ў губернскай гімназіі, дзе ён займаўся з 1902 па 1908 год. Гімназія мела трывалыя дэмакратычныя традыцыі: вучні стваралі гурткі, чыталі забароненыя кнігі. Гімназіст Багдановіч у час першай расійскай рэвалюцыі прымаў удзел у студэнцкіх дэманстрацыях. Значны ўплыў на яго светапогляд у гэты перыяд аказаў М. Горкі, і як чалавек з перадавымі поглядамі, які сябраваў з сям'ёй А. Я. Багдановіча, і як рэвалюцыйна настроены пісьменнік.

Мове сваіх бацькоў, дзядоў і прадзедаў Максім Багдановіч навучыўся з кніг. Кнігі па беларускай мове выклікалі ў душы нявыказную любасць і па-

шану. Менавіта любоў да роднай зямлі, прага ведаў дапамаглі паэту авалодаць беларускай мовай. Калі Адам Ягоравіч пазнаёміўся з рукапісамі сына, ён засведчыў: «Колькі там выпісак са слоўнікаў, зборнікаў і старадрукаваных кніг! Які з паэтаў адолеў бы гэтую цяжкую працу? А ён... падняў. І нёс яе цярпліва і настойліва».

Пісаць на беларускай мове М. Багдановіч пачынаў па-маладому акрылена і ўзнёсла. Першым творам было апавяданне «Музыка». У ім раскрываецца тэма неўміручасці мастацтва, яго сапраўднае прызначэнне ў жыцці. Пазней гэта тэма зойме прынцыпова важнае месца ў літаратурнай дзейнасці паэта. Першае апавяданне было апублікавана ў віленскай газеце «Наша ніва» 6 ліпеня 1907 года, калі аўтару яшчэ не было і 16 год. (Успомнім: толькі да пяцігадовага ўзросту ён пражыў на роднай беларускай зямлі). Малады чалавек, які амаль не памятаў роднага краю, аддзелены ад беларускай зямлі сотнямі вёрст, заспяваў аб ёй велічную і прыгожую, бязрадасную і балючую, гнеўную і грозную песню. І заспяваў яе на роднай матчынай мове...

Беларусь, твой народ дачакаецца
Залацістага, яснага дня.
Паглядзі, як усход разгараецца,
Сколькі ў хмарах залётных агня.

Праз усё жыццё пранёс паэт любоў да беларускай мовы. Край васільковых палёў усе гады няспынна вабіў Багдановіча. Ён імкнуўся ў Беларусь, на радзіму, дзе асабліва блакітнае неба, асабліва буйныя зоркі...

Першы раз пасля дзяцінства наведаў ён Беларусь улетку 1911 года. Дваццацігадовы выпускнік Яраслаўскай гімназіі па запрашэнню супрацоўнікаў рэдакцыі газеты «Наша ніва» прыехаў у Вільню. Тут ён убачыўся са сваімі завочнымі сябрамі, якіх дагэтуль ведаў толькі па перапісцы і па творах. Паэта ўразіла старажытняя Вільня, калекцыя слуцкіх паясоў. Напэўна, менавіта гэта калекцыя і натхніла яго на верш «Слуцкія ткачыхі»:

Ад родных ніў, ад роднай хаты
У панскі двор дзеля красы
Яны, бяздольныя, узяты
Ткаць залатыя паясы.
А за сцяной смяецца поле,
Зіяе неба з-за акна,—
І думкі мкнуцца мімаволі
Туды, дзе расцвіла вясна;
Дзе блішча збожжа ў яснай далі,
Сінеюць міла васількі;
Халодным срэбрам ззяюць хвалі




*Вокладка прыжыццёвага зборніка паэта*
*Обложка прижизненного сборника поэта*

Між гор ліючайся ракі;
Цямнее край зубчаты бора...
І тчэ, забыўшыся, рука,
Заміж персідскага ўзора
Цвяток радзімы васілька.

У Вільні паэт правёў некалькі дзён, а затым амаль два месяцы жыў у фальварку Ракуцёўшчына, каля Маладзечна. Фальварак раскінуўся побач з сасновым борам, сярод жытнёвых ніў. Непадалёку знаходзілася вёска з яе вечарынкамі, па-сапраўднаму народнай, каларытнай мовай. Два месяцы вясковага жыцця абагацілі Багдановіча шматлікімі назіраннямі, цікавымі сустрэчамі з простымі працоўнымі людзьмі. Ён літаральна лавіў кожнае жывое слова, заслухоўваўся мелагучнымі беларускімі

песнямі. І кожны напоўнены дзівоснымі гукамі, фарбамі і пахамі дзень увасобіўся пасля ў вершах, якім была наканавана неўміручасць.

Вечар на захадзе ў попеле тушыць
Кучу чырвоных кавалкаў вугля;
Ціха усё; вецер лістка не зварушыць,
Не скалыхнуцца ні траўкай паля;
Цёмныя цені даўжэй у лагчыне,
Птушкі прыстаўшай марудней палёт;
Сумна плыве маладзік бледна-сіні
У небе вячэрнім, зялёным, як лёд;
Іскрацца зорак сняжынкі маркотна,
Збожжа пакрылася шызай расой...

У Ракуцёўшчыне напісаны цыклы вершаў «Старая Беларусь» і «Места», а таксама паэмы «У вёсцы» і «Вераніка», што ўвайшлі ў цыкл «Мадонны». Пазней яны былі ўключаны ў адзіны прыжыццёвы зборнік «Вянок», які выйшаў у 1913 годзе.

Сярод маляўнічых Ракуцёўскіх пагоркаў і ўзлескаў, сярод кустоўя вербалозу і алешніку ў 1977 годзе быў пастаўлены своеасаблівы помнік: два камяні з маладзечанскіх палёў ляглі тут невачна. Адзін з іх — высокі, вастраваты цягнецца ўгару, нібы свечка, запаленая ў гонар паэта ўдзячнымі нашчадкамі. Другі — пакаты, на ім мемарыяльная дошка з надпісам: «У в. Ракуцёўшчыне ў 1911 годзе жыў і працаваў вядомы беларускі паэт Максім Багдановіч». Крыху ніжэй паэтавы радкі:

Хоць зернейкі засохшымі былі,
Усё ж такі жыццёвая іх сіла
Збудзілася і буйна ўскаласіла
Парой вясенняй збожжа на раллі.

Побач з валунаамі на ўзгорку расце Максімаў сад, які 24 красавіка 1981 года пасадзілі беларускія пісьменнікі.

Пасля паездкі ў Беларусь М. Багдановіч плённа займаецца беларусазнаўствам. Ён марыў паступіць на філалагічны факультэт Пецярбургскага універсітэта, куды быў рэкамендаваны рэдакцыяй газеты «Наша ніва» акадэміку А. А. Шахматаву. Але па настаянню бацькі прыйшлося паступіць у Яраслаўскі Дзямідаўскі юрыдычны ліцэй. Максіма вабіла не юрыспрудэнцыя, а літаратура, таму ў Яраслаўлі ён увесь свой вольны час праводзіў у беларускім зямляцтве, дзе наладжваліся лекцыі па гісторыі роднага краю, чыталіся беларускія вершы, спяваліся беларускія песні. Там ён адчуваў сябе шчаслівым.

У гэты час паэт шмат чытае, вывучае рускую і замежную літаратуры, але па-ранейшаму ўсім сэрцам адданы паэзіі:



*Памятны знак каля*
*вёскі Ракуцёўшчына*
*Памятный знак возле*
*деревни Ракутевщина*

Пяю я з надтрэснутым сэрцам,
Апошні свой скарб аддаю.

Пасля заканчэння юрыдычнага ліцэя, у кастрычніку 1916 года, Максім Багдановіч, ужо цяжка хворы, зноў прыехаў у родную Беларусь. Сухоты, якія забралі маці і старэйшага брата, былі бязлітаснымі і да яго. Паэту заставалася пражыць восем месяцаў...

Даўно ўжо целам я хварэю,
І хвор душой,—
І толькі на цябе надзея,
Край родны мой!
У родным краю ёсць крыніца
Жывой вады.
Там толькі я змагу пазбыцца
Сваёй нуды.

Ішла першая сусветная вайна. Высокі, прыгожы юнак з адухоўленым тварам і крыху сумнымі вачыма прыехаў у Мінск — горад свайго нараджэння.

З 1915 года Мінск быў прыфрантавым. У ім размяшчаўся штаб Заходняга фронту, вайсковыя ўстановы, шпіталі. Горад быў перапоўнены бежанцамі, гаварыў на розных мовах, яго насельніцтва павялічылася ўдвая. Багдановіч пражыў тут пяць месяцаў.

Пасяліўся паэт на кватэры вядомага беларускага пісьменніка Змітрака Бядулі ў доме на Мала-Георгіеўскай вуліцы (цяпер дом № 14 па вул. Л. Талстога). І адразу пачаў працаваць у Мінскім губернскім харчовым камітэце, які размяшчаўся на галоўнай вуліцы горада — Захар'еўскай (цяпер Ленінскі праспект). Камітэт быў створаны па ініцыятыве творчай інтэлігенцыі горада і меў вельмі высакародную мэту: дапамагаць тым, хто пацярпеў у гады імперыялістычнай вайны. У камітэт уваходзілі беларускія пісьменнікі і дзеячы культуры Ядвігін Ш., У. І. Галубок, У. С. Фальскі, Зоська Верас і інш. Камітэтам быў адкрыты клуб пад назвай «Беларуская хатка». Размяшчалася яна ў адным з будынкаў на тым месцы, дзе зараз сквер паміж гарвыканкомам і Домам кіно. Тут наладжваліся вечары паэзіі, беларускай народнай музыкі і песні. Пры клубе працавала сталоўка.

Сталаваўся там і М. Багдановіч. Паснедаўшы, ішоў ён на працу ў Камітэт. Паэт любіў хадзіць па другім баку вуліцы, каб на адлегласці любавацца будынкам касцёла, чырвоная цэгла якога ў час адлігі станавілася серабрыстай.

У Мінску М. Багдановіч многа і плённа працаваў.

Пасля службы ішоў звычайна ў Пушкінскую бібліятэку, потым абавязкова да 3—4 гадзін раніцы працаваў яшчэ дома. «...увесь дзень займаўся народнай творчасцю. У Пушкінскай бібліятэцы праглядаў П. Шэйна і Е. Раманава. ...чытаў вашым сёстрам А. Афанасьева, слухаў, як яны пелі мне народныя песні»,— так расказваў Максім аб адным з дзён Змітраку Бядулю.

За гэтыя пяць месяцаў з-пад пяра паэта выйшла паэма «Страцім-лебедзь», якая стала яго лебядзінай песняй...

Шмат часу аддаваў Максім Багдановіч складанню беларускага буквара, працаваў над літаратурнай хрэстаматыяй для пачатковай школы, напісаў нават для яе некалькі нарысаў. У гэты ж час паэт піша адзін з самых драматычных твораў — верш «Пагоня».

Маці родная, Маці-Краіна!
Не ўсцішыцца гэтакі боль...
Ты прабач, Ты прымі свайго сына,
За Цябе яму ўмерці дазволь!..

...Новы 1917 год М. Багдановіч сустракаў у «Беларускай хатцы» разам са сваімі мінскімі сябрамі. Было многа планаў і надзей, у новым годзе вырашылі нават выдаваць беларускі часопіс. Але здароўе паэта пагоршылася, і ў канцы лютага 1917 г. па патрабаванню сяброў цяжка хворы Максім паехаў на лячэнне ў Крым.

Пра блізкую смерць ён гаворыць у вершах гэтак жа натуральна і проста, як пра жыццё і каханне — без роспачы і страху, з той мудрасцю, з якой успрымаецца яна ў фальклоры:

У краіне светлай, дзе я ўміраю,
У белым доме ля сіняй бухты,
Я не самотны, я кнігу маю
З друкарні пана Марціна Кухты.

Сын Беларусі паміраў у Ялце высакародна і мужна, як і жыў: без нараканняў і скаргі. 25 мая 1917 года, на 26-м годзе жыцця паэта не стала. Бязлітасны лёс абарваў песню на самай прыгожай ноце. Але засталася жыццесцвярджальная паэзія М. Багдановіча:

Жывеш не вечна, чалавек,
Перажывi ж у момант век!
Каб хвалявалася жыццё,
Каб больш разгону ў ім было,
Каб цераз край душы чуццё
Не раз, не два пайшло.
Жыві і цэльнасці шукай,
Аб шыраце духоўнай дбай.

9 снежня 1981 года Максім Багдановіч зноў, і цяпер ужо назаўсёды, вярнуўся ў родны Мінск: у той частцы горада, якая калісьці называлася Троіцкім прадмесцем, да 90-годдзя з дня нараджэння паэта быў адкрыты помнік. Над яго стварэннем працавалі заслужаны дзеяч мастацтваў БССР скульптар С. М. Вакар, архітэктары Ю. І. Казакоў і Л. В. Маскалевіч.

...Паэт нібыта спыніўся сярод буйной зеляніны і стаіць на алеі, якая вядзе да шырокай лесвіцы Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР. Здаецца, што М. Багдановіч сустракае ўсіх, хто ідзе да музыкі.

Стромкая, лёгкая постаць, спакойны позірк скіраваны наперад, у вечнасць. Малады і дзёрзкі, летуценны і неспакойны, узнёслы і акрылены з задуменнымі вачыма на прыгожым, натхнёным твары... Жэст левай рукі паэта падкрэслівае стрыманае хваляванне, у правай — букецік васількоў. Чыстая сінь гэтых кветак напамінала М. Багдановічу яго блакітнавокую Радзіму. З васількамі, як з роднымі землякамі, не раз вітаўся паэт, жывучы далёка ад роднага краю, на Волзе:

Вакол мяне кветкі прыгожа красуюць.
Маркотна між іх я хаджу адзінок,
Аж бачу — мне сіняй галоўкай ківае.
Наш родны, забыты ў цяні васілёк.

М. Багдановіч вярнуўся ў родны горад адлітым з бронзы, вярнуўся, каб быць побач са сваімі землякамі, удыхаць водар роднай зямлі, услухоўвацца ў нашы крокі, у нашы галасы...

Маладыя гады,
Маладыя жаданні!
Ні жуды, ні нуды,
Толькі шчасце кахання,
Будзь жа, век малады,
Поўны светлымі днямі!
Пралятайце, гады,
Залатымі агнямі!

Лірыка М. Багдановіча — вышэйшае выражэнне высакародных чалавечых пачуццяў. Яго паэзія не менш чым сённяшняму належыць будучаму. З усёй спадчыны Багдановіча менавіта яго лірыка бліжэй за ўсё сутыкаецца з сучаснасцю, з маральнай і эстэтычнай патрабавальнасцю нашых людзей. Улада музы Багдановіча над эстэтычным густам і сімпатыямі мільёнаў людзей вельмі вялікая. Зачараваны ўзорам мастацтва мінулага паэт марыў пра стварэнне маладымі творчымі сіламі новых твораў

мастацтва, якія б і праз шмат дзесяцігоддзяў здзіўлялі і захаплялі нас.

Ведай, брат малады, што ў грудзях у людзей
Сэрцы цвёрдыя, быццам з камення.
Разаб'ецца аб іх слабы верш заўсягды,
Не збудзіўшы святога сумлення.
Трэба з сталі каваць, гартаваць гібкі верш,
Абрабіць яго трэба з цярпеннем.
Як ударыш ты ім — ён, як звон, зазвініць,
Брызнуць іскры з халодных каменняў.

М. Багдановіч быў перакананы інтэрнацыяналіст. Сведчанне гэтаму не толькі яго майстэрскія паэтычныя пераклады, але і выдатныя артыкулы пра паэтаў іншых народаў (асабліва пра рускіх і ўкраінскіх) прасякнутыя шчырай братэрскай любоўю і павагай. «Мы зрабілі б цяжкую памылку,— пісаў ён у артыкуле «Забыты шлях»,— калі б кінулі тую вывучку, што нам давала сусветная... паэзія. Было б горш, чым нядбальствам,— нічога не ўзяць з таго, што сотні народаў праз тысячы год сабіралі ў скарбніцу сусветнай культуры. Але заносіць толькі чужое, не развіваючы свайго,— гэта яшчэ горш: гэта значна глуміць народную душу. Да таго ж адны жабракі могуць праз усё жыццё толькі браць. Трэба ж і нам... калі-нікалі даць нешта сваё».

Паэт надзвычай высокай культуры, М. Багдановіч чытаў у арыгінале і перакладаў на родную мову творы антычных паэтаў Гарацыя і Авідзія, нямецкіх — Ф. Шылера і Г. Гейнэ, фінскага паэта Б. Рунеберга, бельгійскага Э. Верхарна, французскага лірыка П. Верлена. Творчасці паэта характэрна філасафічнасць і грамадзянскасць. Аб чым бы ні пісаў Багдановіч, ён заўсёды падкрэсліваў, што думкамі сваімі і творчасцю пастаянна быў звязаны з бацькоўскай зямлёй.

Радзімая зямля, прынікнуў я к табе,
І бадрасць ты ўліла ў слабеючыя жылы,
Зварушыла маёй душы драмаўшай сілы,
І месца ў ёй з тых пор няма ўжо больш жальбе.

За 10 год сваёй тытанічнай, творчай дзейнасці малады паэт, адзін з першых у беларускай літаратуры, пачаў распрацоўку такіх складаных форм, як трыялет, актава, рандо, санет, тэрцыны, скерца:

...вярнуўся я к рандо, санетам,
І бліснуў ярка верш пануры мой:
Як месяц зіхаціць адбітым светам,—
Так вершы ззяюць даўняю красой!

Ба 208050

Паэзія Максіма Багдановіча — узор служэння народу, Радзіме, невычэрпная крыніца крыштальна чыстых пачуццяў, якія здольны акрыляць чалавечыя сэрцы, мінуючы гады і стагоддзі. Любоў да Багдановіча — паэта-лірыка, паэта-філосафа, крытыка, перакладчыка сапраўды ўсенародная. Амаль тры чвэрці стагоддзя гучыць усхваляванае слова паэта ў сэрцах мільёнаў людзей. Мова паэта надзвычай мілагучная і пявучая, і таму зразумела асаблівая прыхільнасць нашых кампазітараў да творчасці М. Багдановіча: многія яго вершы ляглі ў аснову самых разнастайных твораў беларускай вакальнай музыкі. Найбольш буйным музычным творам, амаль поўнасцю заснаваным на вершах М. Багдановіча, з'яўляецца опера «Зорка Венера» (кампазітар Ю. Семяняка, лібрэта А. Бачылы). Прэм'ера яе адбылася на сцэне Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР у 1970 годзе. Кампазітар удала выкарыстаў вытокі паэзіі М. Багдановіча, яе глыбокую сувязь з народнымі песнямі і танцамі.

На вершы М. Багдановіча стваралі рамансы кампазітары М. І. Аладаў, А. В. Багатыроў, А. Е. Туранкоў, Я. А. Глебаў, І. М. Лучанок, Л. К. Захлеўны. Раманс «Зорка Венера» у поўным сэнсе слова стаў адным з самых любімых твораў ужо не для аднаго пакалення, і гэта з'яўляецца той высокай узнагародай, аб якой можна толькі марыць і якая робіць імя паэта неўміручым.

Зорка Венера ўзышла над зямлёю,  
Светлыя згадкі з сабой прывяла...  
Помніш, калі я спаткаўся з табою,  
Зорка Венера ўзышла.  
З гэтай пары я пачаў углядацца  
У неба начное і зорку шукаў.  
Ціхім каханнем к табе разгарацца  
З гэтай пары я пачаў.  
Але растацца нам час наступае;  
Пэўна, ужо доля такая у нас.  
Моцна кахаў я цябе, дарагая,  
Але растацца нам час.  
Буду ў далёкім краю я нудзіцца,  
У сэрцы любоў затаіўшы сваю;  
Кожную ночку на зорку дзівіцца  
Буду ў далёкім краю.  
Глянь іншы раз на яе,— у расстанні  
Там з ёй зліём мы пагляды свае...  
Каб хоць на міг уваскрэсла каханне,  
Глянь іншы раз на яе...

У раёне Троіцкага прадмесця ствараецца Літаратурны музей М. Багдановіча. У экспазіцыйных залах размесцяцца матэрыялы, звязаныя з яго жыц-



Дзяржаўная бібліятэка БССР

цём і творчай дзейнасцю: рукапісы, дакументы розных гадоў жыцця паэта, кнігі, рэчы, якімі некалі карыстаўся пясняр, выданні яго твораў, фотаздымкі, графічныя і скульптурныя работы, творы жывапісу.

Сімвалам паэзіі М. Багдановіча стала слова «зорка». Паэт пакінуў нас вельмі маладым, але яго талент яркай зоркай свеціць людзям,— і за гэта мы навечна ўдзячны яму. Яго зорка дорыць нам «светлыя згадкі», будзіць у нашых сэрцах пачуццё прыгажосці, любоў да роднай Беларусі.

Выйдзіце ў вечар. Выйдзіце ў ноч. Зірніце на расцвіўшае зорнае неба...

...«Бачыце гэтыя буйныя зоркі,
Ясныя зоркі Геркулеса?
Да іх ляціць наша сонца,
І нясецца за сонцам зямля.
Нашто ж на зямлі
. . . . . . . . . . . . . . . .
Сваркі і зводкі, боль і горыч,
Калі ўсе мы разам ляцім
Да зор?»

Зоры ў небе, зоры ў сэрцах. Няхай яны ніколі не згаснуць. І няхай заўсёды свеціць ясная Зорка паэзіі М. Багдановіча.

Вы мне говорите, что сердце поэта,
Когда он рождает поэзии чудо,
Небесным огнем обогрето...

В истории каждого народа есть имена, которыми он особенно гордится. Среди них есть такие, которые стали достоянием человечества, ибо слава о них перешагнула границы стран и времен. Белорусский поэт Максим Богданович приобрел известность благодаря своему литературному таланту, гражданским и человеческим качествам. Его имя заслуженно стоит рядом с именами славных основателей современной белорусской литературы — Янки Купалы и Якуба Коласа.

Звонкая лира Богдановича, чрезвычайно богатая по содержанию, наполнена той силой веры в тру-

довой народ, которая сделала поэта одним из прогрессивных людей своего времени.

Максим Богданович был не только автором пейзажной, любовной, социально-философской лирики, фольклорно-эпических поэм, но и самобытным прозаиком-повествователем, эссеистом, мастером поэтического перевода, тонким, блестящим литературным критиком и глубоким ученым-исследователем — одним из основателей белорусского литературоведения. Поэзия Максима Богдановича, проникнутая жизнеутверждающим пафосом, напоминает свет живого пульсирующего сердца, которое однажды вырвалось из груди сына Белоруссии и перелилось в неугасающую зорьку Венеру над просторами родной земли.

Разгорайся быстрее, огонь мой, во мгле,
Пусть же ветер тебя не пугает:
Гасит он только слабый огонь на земле,
А окрепший — сильней раздувает.

...На доме № 25 по ул. М. Горького (бывшей Александровской) установлена мемориальная доска с барельефом поэта. На ней слова:

*«На этом месте находился дом,*
*в котором 9 декабря (27 ноября)*
*1891 года родился известный белорусский*
*поэт Максим Богданович».*

На холме, где стоит сегодня Государственный академический Большой театр оперы и балета БССР, находился Троицкий базар, а напротив — этот двухэтажный деревянный дом. На первом этаже размещалось городское начальное училище, на втором — квартира учителя. Ее занимала семья Богдановичей: Адам Егорович заведовал училищем и преподавал, а Мария Афанасьевна воспитывала своих детей. В этой квартире и родился Максим Богданович — человек необыкновенного таланта и судьбы.

Знакомых и друзей у семьи было много: учителя, врачи, офицеры. В доме часто собиралась молодежь, звучали песни, декламировались стихи...

Отец поэта, Адам Егорович, закончил Несвижскую учительскую гимназию. Работая учителем, увлекался этнографией, изучал и собирал фольклор. Он был высокообразованным человеком с передовыми взглядами. Его работы — этнографические, литературоведческие, языковедческие — вошли в историю белорусской и русской культуры, были замечены и высоко оценены специалистами.

Образованность отца, прекрасное знание им

фольклора, педагогическая подготовка способствовали всестороннему развитию Максима.

Мария Афанасьевна была женщиной доброй, веселой, красивой, с искринкой в глазах и с прекрасной длинной косой. Она имела специальную музыкальную подготовку, хороший голос. Среди песен, которые она любила петь, был романс М. И. Глинки «Северная звезда». И позже, через много лет, поэт часто слушал в граммофонной записи волнующую мелодию своего детства.

Когда Максиму было полгода, семья переехала в Гродно, и раннее детство мальчика прошло в городе над Неманом. Поселились на окраине города. Во дворе рос небольшой сад, вокруг были поля, леса и Неман. Жили Богдановичи дружно и счастливо.

Мальчик очень любил, когда мама играла на фортепьяно, ее любимые произведения становились и его любимыми. Как и матери, М. Богдановичу нравился романс «Выхожу один я на дорогу» на слова М. Ю. Лермонтова, «Эллегия» Маснэ, полонез «Прощание с родиной» М. Огинского, хор девушек из «Оскольдовой могилы» А. Верстовского, произведения А. С. Доргомыжского, М. И. Глинки, народные песни. Музыка вошла в жизнь поэта очень рано и оказала определенное влияние на все его последующее творчество.

Мария Афанасьевна много читала, имела литературные склонности. Ее рассказ был напечатан в «Гродненских губернских ведомостях».

Мать поэта была очень чуткой, впечатлительной и необыкновенно находчивой в выдумках всевозможных развлечений для детей, сама отдавалась играм с искренним увлечением. По воспоминаниям отца, Максим мягким характером, веселостью, живостью, отзывчивостью и впечатлительностью, пластичностью и точностью наблюдений напоминал свою мать.

Образ той, что дала ему жизнь, как и образ Родины, вечно жил в сердце Максима, будил непреодолимое стремление к белорусской земле, белорусскому народу, белорусскому языку.

Атмосфера семьи оказала большое влияние на формирование таланта будущего поэта. С детских лет с волнением слушал он сказки и песни матери, с интересом читал очерки и статьи отца — известного белорусского исследователя, этнографа, увлекался белорусскими сказками, записанными фольклористами и этнографами П. В. Шейном и Е. Р. Романовым.

Учиться Максим начал с шести лет. Его первыми книгами были «Родное слово», «Детский мир и Хрестоматия» К. Д. Ушинского, русские былины, «Слово о полку Игореве», былины и песни других народов: «Эдда», «Песнь о Нибелунгах», «Песнь о Роланде», «Песнь о моем Сиде», «Одиссея», «Иллиада». Из мировой и русской классики Максима привлекали Т. Тасо, А. Данте, С. Сервантес, Д. Дефо, А. Мицкевич, А. С. Пушкин, Н. В. Гоголь, И. С. Тургенев, Г. И. Успенский. Книги систематизировали то, что приходилось наблюдать в жизни, помогали формированию мировоззрения. Позже М. Богданович говорил своему другу М. Огурцову, с которым вместе работал в Ярославской газете «Голос»: «Меня воспитывал отец. Как-то я показывал Вам его библиотеку. В ней есть все существенное, что появлялось когда бы то ни было в мировой литературе. Мы с детства проходили эту всемирную школу. Отец начинал с того, с чего начинает каждый народ в своем творчестве,— с эпоса. Мы в детстве знали «Слово о полку Игореве», «Иллиаду», «Калевалу» и др. Затем приступили к лирике и драме. Главное место, естественно, уделялось славянским литературам».

Талантливый от природы, наделенный поэтической душой, маленький Максим имел прекрасные условия для развития лучших своих задатков, но в октябре 1896 года на двадцать восьмом году жизни умерла от туберкулеза мать. Потеря самого родного человека глубокой болью отозвалась в чутком сердце пятилетнего мальчика.

В ноябре отец с осиротевшими детьми (Вадимом, Максимом, Левой и Ниной) переехал в Нижний Новгород. Воспитывать детей сначала ему помогала сестра Мария Егоровна, а потом их тетя по матери Александра Афанасьевна.

В городе на Волге Максим Богданович провел почти половину своей жизни. Любил выходить на крутой берег Волги, наблюдать беспрерывный бег воды в берегах. Часто смотрел он на старую кремлевскую стену, на запад, в сторону многострадальной Белоруссии. По рассказам отца перед его глазами вставали страшные картины из жизни белорусского народа. Здесь, в Нижнем Новгороде, ему приходилось видеть невыносимые условия жизни рабочих крупного промышленного города, и постепенно в душе поэта нарастал протест.

Губернская гимназия, где юноша учился с 1902 по 1908 год, имела славные демократические традиции: учащиеся организовывали кружки, тайно чи-

тали запрещенные книги. Гимназист Богданович во время первой русской революции принимал участие в студенческих демонстрациях. Значительное влияние на его мировоззрение в этот период оказал М. Горький — и своими проникнутыми революционным духом произведениями, и своими передовыми взглядами. А. М. Горький в эти годы дружил с семьей А. Е. Богдановича.

Языку своих отцов, дедов и прадедов Максим Богданович учился по книгам. Книги на белорусском языке вызывали восторг, он гордился своей принадлежностью к этому народу. Любовь к родной земле, жажда знаний помогли поэту овладеть белорусским языком. Познакомившись с рукописями сына, Адам Егорович отмечал: «Сколько там выписок из словарей, сборников и старопечатных книг! Какой из поэтов, всосавших белорусскую речь с молоком матери, поднимал этот тяжелый, кропотливый, крохоборческий труд? А он... поднял. И нес его терпеливо и упорно».

Писать на белорусском языке Максим Богданович начинал по-молодому возвышенно и окрыленно. Его первым произведением был рассказ «Музыка». В нем раскрывается тема бессмертия искусства, его настоящее назначение в жизни. Позже эта тема займет принципиально важное место в литературной деятельности поэта. Первый рассказ был опубликован в Виленской газете «Наша нива» 6 июля 1907 года, когда автору не было и 16 лет. Вспомним: только до пятилетнего возраста он прожил на родной белорусской земле. Молодой поэт, который почти не помнил родного края, отделенный от белорусской земли сотнями верст, запел о ней величественную и прекрасную, безрадостную и горькую, гневную и грозную песню. И запел ее на родном, материнском языке.

Беларусь, твой народ поднимается
Встретить солнце погожего дня.
Глянь, какая заря разгорается,
Сколько в тучках залетных огня!

Через всю жизнь пронес поэт любовь к белорусскому языку. Этот край, его леса, поля с васильками во ржи все годы безудержно манили Богдановича. Он стремился в Белоруссию, на родину, где небо особенно голубое, звезды особенно яркие...

Первый раз после детства Богданович навестил Белоруссию летом 1911 года. Двадцатилетний выпускник Ярославской гимназии по приглашению сотрудников редакции газеты «Наша нива» приехал в Вильно. Здесь он увиделся со своими заоч-

ными друзьями, которых до встречи знал только по переписке и по книгам. Поэта поразил древний Вильно, коллекция слуцких поясов, которую он там увидел в музее. Наверно, эта коллекция и вдохновила его на стихотворение «Слуцкие ткачихи»:

От нив родных, где в переливах
На васильках блестит роса,
На двор господский привели их
Ткать золотые пояса.
До вечера с рассветной рани,
Забыв о снах девичьих, ткут
Свои узорчатые ткани.
А за стеной — светло, раздольно.
И небо — за крестом окна.
И мысли тянутся невольно
Туда, где воля и весна;
Туда, где зеленеют нивы,
Синеют нежно васильки,
Где льется меж холмов лениво
Живое серебро реки.
Темнеет край зубчатый бора,
И, забываясь, ткет рука
Взамен персидского узора
Цветок родного василька.

В Вильно поэт провел несколько дней, а затем почти два месяца жил в фольварке Ракутевщина, около Молодечно. Фольварок раскинулся рядом с сосновым бором, среди ржаных полей. Недалеко находилась деревня с ее вечеринками, народным колоритным языком. Два месяца деревенской жизни обогатили Богдановича многочисленными наблюдениями, интересными встречами с простым народом. Он буквально ловил каждое живое слово, заслушивался мелодичными белорусскими песнями. И каждый наполненный дивными звуками, красками, запахами день воплотился позже в его бессмертных стихах.

Вечер на западе в перистом пепле
Тушит червоную кучу углей.
Ветер не треплет деревья у гребли,
В поле не зыблются струны стеблей.
Темные тени длиннее в низине,
Медленной птицы усталый полет;
Грустно скользит отливающей синью
Месяц по тверди, зеленой, как лед.
Звездочки, словно снежинки, повисли...
Колос согнулся под сизой росой...

В Ракутевщине написаны циклы стихов «Старая Беларусь», «Место», а также поэмы «В деревне», «Вероника», которые составили цикл «Мадонны». Позже они вошли в единственный прижизненный сборник «Венок», который вышел в 1913 году.

Над живописными Ракутевскими полями и пригорками, над разросшимся ивняком и ольшаником в 1977 году был поставлен своеобразный памятник: два камня с молодечненских полей легли здесь навечно. Один из них высокий, островатый тянется вверх, словно свеча, зажженная в честь поэта благодарными потомками. Второй — округлый, на нем мемориальная доска с надписью: «В д. Ракутевщина в 1911 году жил и работал известный белорусский поэт Максим Богданович». Немного ниже стихотворные строки.

Рядом с камнями-валунами на пригорке растет Максимов сад, посаженный белорусскими писателями 24 апреля 1981 года.

После посещения Белоруссии М. Богданович мечтал заняться белорусоведением и поступить для этого на филологический факультет Петербургского университета, куда был рекомендован редакцией газеты «Наша нива» академику А. А. Шахматову. Но по просьбе отца пошел учиться в Ярославский Демидовский юридический лицей. Максима привлекала не юриспруденция, а литература, поэтому в Ярославле он все свободное время проводил в белорусском землячестве, где можно было послушать лекцию по истории родного края, почитать белорусские стихи, спеть белорусскую песню. Там он отдыхал душой и чувствовал себя счастливым.

В это время поэт много читает, изучает русскую и зарубежную литературу, но по-прежнему всем сердцем отдан поэзии:

Пою я с надтреснутым сердцем,
Последний свой клад отдаю.

После окончания юридического лицея, в ноябре 1916 года, Максим Богданович уже тяжело больным вновь приехал в родную Беларусь. Туберкулез, забрав мать и старшего брата, был безжалостным и к нему. Поэту осталось прожить только восемь месяцев.

Шла первая мировая война. Высокий, красивый юноша с одухотворенным лицом и немного грустными глазами приехал в Минск — город своего рождения.

Давно и телом я хвораю,
И хвор душою,—
И на тебя лишь уповаю,
Мой край родной!
Есть родничок с водой живою
В родном краю.
Смогу я смыть лишь той водою
Печаль свою.

С 1915 года Минск был прифронтовым. В нем размещался штаб Западного фронта, военные учреждения, госпиталя. Город был переполнен беженцами, говорил на разных языках, население его увеличилось вдвое. М. Богданович провел тут пять месяцев.

Поселился поэт на квартире известного белорусского писателя З. Бядули, в доме на Мало-Георгиевской улице (теперь дом № 14 по ул. Л. Толстого) и сразу начал работать в Минском губернском продовольственном комитете, который размещался на главной улице города — Захарьевской (теперь Ленинский проспект). Комитет был образован по инициативе творческой интеллигенции города и ставил перед собой благородную цель: помогать тем, кто пострадал в империалистическую войну. В комитет входили белорусские писатели и деятели культуры Ядвигин Ш., В. И. Голубок, В. С. Фальский, Зоська Верас и др. Комитетом был открыт клуб под названием «Белорусская хатка». Размещалась она на месте сегодняшнего сквера между Домом кино и горисполкомом. Здесь организовывались вечера поэзии, белорусской народной музыки и песни. При клубе работала столовая. Позавтракав в ней, Богданович шел на работу в комитет.

Поэт любил ходить по противоположной стороне Захарьевской и на расстоянии любоваться костелом, красные кирпичи которого во время оттепели становились серебристыми.

В Минске М. Богданович много и плодотворно работал. После службы шел обычно в Пушкинскую библиотеку, потом обязательно до 3—4 часов утра работал дома. «...Весь день занимался народным творчеством. В Пушкинской библиотеке просматривал П. Шейна, Е. Романова, ...читал вашим сестрам А. Афанасьева, слушал, как они пели мне народные песни»,— так рассказывал Максим об одном из дней З. Бядуле.

За эти пять месяцев из-под пера поэта вышла поэма «Стратим-лебедь», которая стала его лебединой песней.

Много времени отдал Максим Богданович составлению белорусского букваря, работал над литературной хрестоматией для начальной школы, написал для нее несколько очерков. В это же время поэт пишет одно из самых драматических произведений — стихотворение «Погоня».

Отчий край, эта боль неизбывна,—
Будет жечь неотступно и впредь...
Ты прими покаяния сына,
И позволь за тебя умереть...

...Новый, 1917 год М. Богданович встречал в «Белорусской хатке» вместе со своими минскими друзьями. Было много планов и надежд, в новом году решили издавать белорусский журнал. Но здоровье поэта резко ухудшилось, и в конце февраля 1917 года по настоянию друзей тяжело больной Максим уехал на лечение в Крым.

О близкой смерти он говорит в стихах так же естественно и просто, как о жизни и любви — без отчаяния и страха, с той мудростью, с какой воспринимается она в фольклоре.

В последний час мой душа не сникла:
В сторонке светлой, у синей бухты
Не одинок я, со мною книга —
Изданье пана Мартина Кухты.

Сын Белоруссии умирал в Ялте благородно и мужественно, как и жил; без сетований и жалоб. 25 мая 1917 года, на 26-м году жизни поэт умер. Судьба безжалостно оборвала песню на самой прекрасной ноте. Но осталась жизнеутверждающая поэзия М. Богдановича.

Живешь не вечно, человек,—
Умей прожить в мгновенье век!
Дела хорошие верши,
Пускай наступит звездный час,
Пусть чувство через край души
Переплеснет не раз!..

Живи, о цельности своей
И о духовности радей.

9 декабря 1981 года Максим Богданович снова, и теперь уже навсегда, вернулся в родной Минск: в той части города, которая когда-то называлась Троицким предместьем, к 90-летию со дня рождения поэта был открыт памятник. Над его созданием работали заслуженный деятель искусств БССР скульптор С. М. Вакар, архитекторы Ю. И. Казаков, Л. В. Москалевич.

...Поэт словно остановился среди зелени и стоит на аллее, которая ведет к широкой лестнице Государственного академического Большого театра оперы и балета БССР, словно встречая всех, кто идет к музыке.

Стройная, легкая фигура, спокойный взгляд устремлен вперед, в вечность. Молодой и дерзкий, мечтательный и неспокойный, возвышенный и окрыленный с задумчивыми глазами на красивом, вдохновенном лице... Жест левой руки поэта подчеркивает сдержанное волнение, в правой — букетик ва-

сильков. Чистая синь этих цветов напоминала М. Богдановичу его голубоглазую Родину. С васильками, как с родными земляками, не раз встречался поэт далеко от родного края, на Волге:

Цветы свою нежность в лучах изливают.
Уныло меж ними хожу одинок.
Вдруг вижу — мне синей головкой кивает
Родимый, забытый в тени василек.

М. Богданович вернулся в родной город отлитым из бронзы, вернулся, чтобы быть рядом со своими земляками, вдыхать аромат родной земли, вслушиваться в наши шаги, в наши голоса...

Молодые года,
Молодые желанья!
И любовь — навсегда! —
И ни тени страданья.
Так пребудь же всегда
Полон юными днями!
Пролетайте, года,
Золотыми огнями!

Лирика М. Богдановича — высшее выражение благороднейших человеческих чувств. Его поэзия не менее чем настоящему принадлежит будущему. Из всего наследия Богдановича именно лирика самым теснейшим образом соприкасается с нравственной и эстетической потребностью наших современников. Власть лиры Богдановича над эстетическим вкусом и симпатиями миллионов людей обширна и велика.

Вместе с восхищением и почитанием высочайших образцов искусства прошлых времен всех народов поэт мечтал о создании молодыми творческими силами новых произведений, достойных встать рядом с шедеврами прошлого и способных тронуть самые суровые сердца:

Знай же, брат молодой, что людские сердца
Черствы, тверды, как будто каменья.
Стих, коль слаб он и тих, разобьется о них,
Не вдохнув в них святого горенья.
Строки гибкие надо из стали ковать;
Закалять, шлифовать их — с терпеньем.
Как ударишь — набатно они зазвучат
Так, что искрами брызнут каменья.

М. Богданович был убежденным интернационалистом. Свидетельством тому являются не только его мастерские поэтические переводы, но и прекрасные, содержательные статьи о поэтах других народов, пронизанные искренней братской любовью и

уважением. «Мы сделали бы большую ошибку,— писал он в статье «Забытый путь»,— если бы забыли все то, что нам давала мировая поэзия. Было бы больше, чем нерадивость,— ничего не взять из того, что сотни народов тысячи лет собирали в сокровищницу мировой культуры. Но заносить только чужое, не развивая своего,— это еще хуже: это значительно портит народную душу. К тому же одни только нищие могут всю жизнь только брать. Нужно же и нам... иногда дать что-то свое».

Поэт необычайно высокой культуры, М. Богданович читал в оригинале и переводил на родной язык произведения античных поэтов Горация и Овидия, немецких — Ф. Шиллера и Г. Гейне, финского поэта Б. Рунеберга, бельгийского Э. Верхарна, французского лирика Поля Верлена. Творчеству поэта характерна философичность и гражданственность. О чем бы ни писал Богданович, он всегда подчеркивал, что мыслями своими и творчеством постоянно связан с землей отцов:

Родимая земля, приникнул я к тебе,
И бодрость ты влила в слабеющие жилы,
Расшевелила ты души дремавшей силы,—
С тех пор в ней места нет ни стонам, ни мольбе...

За 10 лет своей титанической, творческой деятельности молодой поэт один из первых в белорусской литературе начал разработку таких сложных поэтических форм, как триолет, октава, рондо, сонет, терцина, скерцо:

...обратился я к рондо, сонетам,
И ярко вспыхнул стих угрюмый мой:
Как месяц светит отраженным светом,
Так он сияет древней красотой!

Поэзия Максима Богдановича — пример служения народу, Родине, неисчерпаемый источник кристально чистых чувств, которые способны окрылять человеческие сердца, минуя года и столетия. Любовь к Богдановичу — поэту-лирику, поэту-философу, критику, переводчику поистине всенародная. Почти три четверти века звучит его взволнованное слово в сердцах миллионов людей. Язык поэта необычайно мелодичный и певучий, и понятна поэтому особенная приверженность наших композиторов к творчеству М. Богдановича: многие его стихи легли в основу самых различных жанров произведений белорусской вокальной музыки. Наиболее значительным произведением, почти полностью основанном на стихах М. Богдановича, является опера «Зорька Венера» (композитор Ю. В. Се-

меняко, либретто А. Бачилы). Премьера ее состоялась на сцене Государственного академического Большого театра оперы и балета БССР в 1970 году. Композитор удачно использовал истоки поэзии М. Богдановича, ее глубокую связь с народными песнями и танцами.

На стихи Богдановича создавали романсы композиторы Н. И. Аладов, А. В. Богатырев, А. Е. Туренков, Е. А. Глебов, И. М. Лученок, Л. К. Захлевный. Романс «Зорька Венера» стал одним из самых любимых народных произведений не для одного поколения. И уже это является той высокой наградой, о которой можно только мечтать и которая делает имя поэта бессмертным.

Ярко Венера взошла над землею,
Воспоминанья с собой привела,—
Помнишь, при нашем знакомстве с тобою,
Ярко Венера взошла.
С этого вечера я с ней встречаюсь
В час, когда в сини погаснет заря...
Тихой любовью к тебе разгораюсь
С этого вечера я.
Но расставаться пора наступила,
Видно, судьба к нам не очень добра.
Как тебя, милая, крепко любил я,
Но расставаться пора.
Буду в далеком краю на Венеру
С грустью смотреть я... Любовь затаю...
В сердце лелеять надежду и веру
Буду в далеком краю.
Глянь же и ты иногда, дорогая,—
Пусть же сольет наши взоры звезда,
Вечным сияньем любовь воскрешая!
Глянь же и ты иногда...

В районе Троицкого предместья недалеко от памятника песняру создается Литературный музей М. Богдановича. В экспозиционных залах разместятся материалы, связанные с его жизнью и творческой деятельностью: рукописи, документы разных лет жизни поэта, книги, личные вещи, издания его произведений, фотографии, графические и скульптурные работы, произведения живописи.

Символом поэзии М. Богдановича стало слово звезда (зорка). Поэт ушел от нас очень молодым, но его талант яркой звездой светит людям, и за это мы всегда благодарны ему. Его звезда дарит нам «светлыя згадкі» (воспоминания), будит в наших сердцах чувство прекрасного, любовь к родной Белоруссии. Выйдите вечером. Выйдите ночью. Посмотрите на расцветшее звездное небо:

Видите яркие крупные звезды
Там, в созвездии Геркулеса?

Дзяржаўная бібліятэка БССР

Бел. 2005

Это к ним летит наше солнце,
И несется за солнцем земля.
К чему же на земле
. . . . . . . . . . . . . . . . .
Споры и распри, боль и горечь,
Если к звездам
Все вместе
Летим?

Звезды в небе, звезды в сердце. Пусть они никогда не погаснут. И пусть всегда светит нам ясная звезда поэзии Максима Богдановича.

---

**Николай Арсентьевич Чирский**

**МАКСИМ БОГДАНОВИЧ В МИНСКЕ**

Минск, издательство «Полымя»
*На белорусском и русском языках*

Загадчык рэдакцыі *Т. Г. Мінчукова*
Рэдактар *І. В. Кісялёва*
Мастацкі рэдактар *В. А. Ярмоленка*
Тэхнічны рэдактар *Т. А. Тарасенка*
Карэктар *Л. І. Жылінская*

ИБ № 314

Здадзена ў набор 22.08.85. Падпісана да друку 17.02.86. АТ 19022. Фармат 84×90$^1/_{32}$. Папера мелаваная. Гарнітура літаратурная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 1,40. Ум. фарб.-адб. 1,84. Ул.-выд. арк. 1,51. Тыраж 5000 экз. Выд. № 4704. Зак. 1759. Цана 15 к.

Выдавецтва «Полымя» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Мінск, 220600, пр. Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

B00000002594470




